# Засталіся Памяць, Кнігі і Музей



АДЫШЛА Ў ВЕЧНАСЦЬ НІНА БАРЫСАЎНА ВАТАЦЫ. ЯЕ ЗЯМНЫ ШЛЯХ ДОЎЖЫЎСЯ АМАЛЬ 90 ГАДОЎ.

Засталася Памяць. Памяць пра незабыўную Ніну Барысаўну — "галоўнага бібліёграфа аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі" (Беларускія пісьменнікі. Бібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т. 1. Абуховіч — Ватацы. Мн., 1992. С. 539.).

Памяць пра яе унікальныя энцыклапедычныя веды, мужнасць і прыгажосць, апантанасць бібліяграфіяй і спагадлівае стаўленне да чытачоў — многія з якіх, прайшоўшы праз беларускі аддзел былой "Ленінкі" (цяпер Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі), у сваім даробку абавязаны менавіта Ніне Барысаўне. Свой куточак у аддзеле, куточак утульны і нейкі незвычайны, мабыць, сваёй святасцю, яна пакідала позна вечарам, разам з апошнімі чытачамі. (Шкадую, што не ўгаварыў кінематаграфістаў ці тэлевізіёншчыкаў зняць фільм... Намаляваць словам гэты куточак не здолею).

Засталіся Кнігі. Іх шмат. Найперш — бібліяграфіі. Асобных выданняў мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і крытыкі, драматургіі. Дапаможнікі, прысвечаныя Я.Купалу, Я.Коласу, М.Багдановічу, К.Крапіве, М.Лынькову, І.Шамякіну... Гісторыка-літаратурныя артыкулы склалі кнігу "Шляхі".

Застаўся Музей. Музей Максіма Багдановіча. Шмат гадоў Ніна Барысаўна даследавала жыццё і творчасць Багдановіча, увяла ў навуковы абыходак невядомыя творы, дакументы, фатаграфіі. Яна склала зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў "Шлях паэта", паказальнік выданняў, аўтографаў і крытычнай літаратуры. Марыла пра музей. Памагала яго стварыць, перадала музею сваю калекцыю дакументаў пра паэта. І якой жа яна была шчаслівай на прыступках камяніцы ў Троіцкім прадмесці ў снежні 1991 года, калі ўрачыста адкрываўся музей Максіма.

*Віталь Скалабан*

**Спіс асноўных прац галоўнага бібліятэкара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Ватацы Н.Б.**

1. Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі, (1917 — 1960): Бібліягр. асоб. выд. — Мн.: Дзяржвыд БССР, 1962. — 462 с.
2. Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі, (1961 — 1968): Бібліягр. асоб. выд. — Мн.: Беларусь, 1971. — 368 с.
3. Белорусская литература: Крат. рек. указ. — М.,1957. — 158 с.
4. Беларуская савецкая драматургія (1917 — 1965): Бібліягр. — Мн.: Кн.палата БССР, 1966. — 276 с.
5. Беларуская драматургія (1966 — 1986): Бібліягр. давед./Нац.б-ка Беларусі. — Мн.,1993. — 445 с.
6. Беларускае савецкае літаратуразнаўства і крытыка (1945 — 1963): Бібліягр. асоб. выд. — Мн., 1964. — 191 с.
7. Янка Купала, (1882 — 1942): Бібліягр. давед. — Мн.: Выд-ва АН БССР, 1953. — 86 с.
8. Якуб Колас. Да 70-годдзя з дня нараджэння: Бібліягр. давед. — Мн.: Выд-ва АН БССР, 1952. — 73 с.
9. Якуб Колас. К 70-летию со дня рождения. — М., 1952. — 54 с.
10. Якуб Колас. Да 80-годдзя з дня нараджэння: Бібліягр. давед. — Мн., 1962. — 186 с. — Сумесна з: Пратасевіч М., Базарэвіч М.
11. Якуб Колас. Памятка читателю. — М., 1957. — 26 с.
12. Максім Багдановіч. Да 70-годдзя з дня нараджэння: Бібліягр. давед. — Мн.: Выд-ва газ. "Мінская праўда", 1961. — 77 с.
13. Шлях паэта: Зб. успамінаў і біягр. матэрыялаў пра Максіма Багдановіча. — Мн.: Маст. літ., 1975. — 155 с.
14. Максім Багдановіч: Паказ. тв., аўтографаў і крытыч. літ. — Мн.: Дзярж. б-ка БССР, 1977. — 155 с.
15. Кузьма Чорны, (1900 — 1944): Бібліягр. давед. — Мн., 1954. — 83 с.
16. Паўлюк Трус: Бібліягр. памятка. — Мн., 1958. — 31 с.
17. Кандрат Крапіва: Бібліягр. даведнік. — Мн., 1963. — 191 с.
18. Міхась Лынькоў. Да 60-годдзя з дня нараджэння: Бібліягр. даведнік. — Мн., 1959. — 89 с.
19. Пятро Глебка: Карот. бібліягр. даведнік. — Мн.: Дзяржвыд БССР, 1957. — 84 с.
20. Пімен Панчанка: Бібліягр. памятка. — Мн., 1958. — 38 с.
21. Іван Шамякін: Бібліягр. памятка чытача. — Мн.: Дзяржвыд БССР, 1957. — 25 с.
22. Янка Брыль: Бібліягр. памятка чытача. — Мн.: Дзяржвыд БССР, 1957. — 35 с.
23. Піліп Пестрак: Бібліягр. памятка. — Мн., 1961. — 32 с.